Viestki547.qxd 9/25/2011 7:03 PM Page 1 (3,1)

Весткі й Паведамленьні
Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня
Viestki j Paviedamlenni
№ 9-10 (547-548)
Верасень-кастрычнік 2011 г.
Belarusan American Association, Inc.
P. O. Box 572, New York, NY 10113-0572
Сусьветнае сеціва: www.baza-belarus.org

# Моцнае дрэва альбо слова ўдзячнасьці

*З нагоды хуткага 92-годзьдзя аднаго з старэйшых сябраў Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА, шматгадовага старшыні аддзелу, заснавальніка і доўгагадовага рэдактара бюлетэня "Весткі й Паведамленьні" сп.* ***Аляксандра Міцкевіча*** *перадрукоўваем гэты артыкул з газэты "Беларус" № 556 за травень 2009 г.*



***Аляксандар Міцкевіч, 2008 г.***
*Фота З. Пазьняка.*

Аляксандар Міцкевіч – асоба добра вядомая ў беларускім замежжы. Упершыню я ўбачыў яго ў 1996 годзе на агульным сходзе Нью-Ёркскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня (БАЗА). Ён тады акурат узначальваў гэты аддзел. "Гэта-ж во, – думаю, – рыхтык Якуб Колас сядзіць, толькі вусоў няма". Аказалася, што падабенства не выпадковае. Аляксандар Міцкевіч ёсьць пляменьнікам брата Якуба Коласа, Міхася Міцкевіча (пахаваны ў Нью-Брансўіку ў штаце Нью-Джэрзі). "Моцнае дрэва", – думаю, гледзячы на яго знаёмае па-дзядзьку аблічча, у якім бачная была пячатка знакамітага роду. Лаўлю сябе на міжвольнасьці, што заўсёды новаўбачанага чалавека ацэньваю найперш па выразнасьці і плястыцы аблічча (прывычка з часоў заняцьця фотамастацтвам), а потым ўжо даходжу да сэнсу.

З сэнсам у Аляксандра Міцкевіча якраз усё ў парадку і на вышыні. Гэта самавіты беларус пасьлядоўны ў думках і справах, надзейны прадстаўнік коласаўскага роду. Я вельмі цаню гэтую шляхецкую ліцьвінскую надзейнасьць у людзях і адразу адчуў у ім роднасную натуру, свайго чалавека. "От нам з вамі, як са сваім, вы, як мы, дык адразу і разумеемся", – казала мне камплімэнт некалі спадарыня Яніна Каханоўская (ужо не жыве). Умоўна, па духу я залічваю ўсіх гэтых людзей да фронтаўцаў. Тут і Каханоўская, і дачка яе Юля Андрусышына, і Антон Шукелойць (які запісвае сябе, між іншым, да беларускіх эсэраў), і іншыя, і, вядома-ж, Алесь Міцкевіч.

Што мне падабаецца ў шмат якіх людзях яго пакаленьня і ў ім асабіста – гэта адказнасьць парад Бацькаўшчынай і дзейнасьць у падтрымку беларускай справы ў любых абставінах. Алесь Міцкевіч асабліва дацэньвае арганізацыю і распаўсюд беларускай інфармацыі. У 1990-х ён выдаваў у Нью-Ёрку рэгулярны інфармацыйны бюлетэнь "Весткі і паведамленьні". Потым, калі ўжо па ўзросту адышоў ад кіраўніцтва аддзелам БАЗА, ён заняўся іншай патрэбнай справай. Цікавая ідэя – арганізаваў своеасаблівую інфармацыйную пошту: выдаваў самадрукам, множыў на ксэраксе і рассылаў па пошце ў канвэртах у сотні адрасоў інфармацыйны зборнік, які называў "Цыркуляр". Я пра гэты плённы высілак А. Міцкевіча пісаў некалі ў "Беларускіх Ведамасьцях" (2001 г., № 3 (33), сакавік).

Пасьля майго прыезду ў Нью-Ёрк у 1996 годзе А. Міцкевіч доўга ня думаў. У першай-жа гутарцы са мной сказаў: "Ёсьць тут беларусы, якія жадаюць дапамагаць Народнаму Фронту і вам у вашай дзейнасьці." Праз нейкі час Алесь Міцкевіч знайшоў яшчэ сілы закласьці і падтрымаць ініцыятыву "Беларуская помач" (Белпом) альбо, як ён мне паведаміў, "Групу падтрымкі БНФ". Ён сам рассылаў сябрам гэтай групы свой "Цыркуляр", "Беларускія Ведамасьці", копіі артыкулаў з БВ і іншыя матэрыялы. Таксама ён арганізаваў збор сродкаў на выданьне "Беларускіх Ведамасьцяў" – часапісу, які стаў, фактычна, ворганам БНФ у замежжы.

Аляксандар Міцкевіч, як і шмат тут хто зь беларусаў, упэўнены, што толькі пры наяўнасьці моцных беларускіх рухаў, такіх, як БНФ, могуць адбыцца рэальныя палітычныя зьмены на Беларусі. Дзеля гэтага шмат хто зь беларусаў падтрымаў ягоную ініцыятыву і збор сродкаў. Найбольш шчодра і рэгулярна падтрымлівалі У. Набагез, П. Пікулік, М. Сагановіч. Ім належыцца найперш вялікая падзяка. У тыя часы "Беларускія Ведамасьці" выходзілі па 8-10 нумароў у год. Усё гэта ў тым ліку, дзякуючы таксама і збору сродкаў, арганізаваным Аляксандрам Міцкевічам. (Цяпер БВ выходзяць ня больш трох нумароў на год. Адбылася зьмена пакаленьняў у эміграцыі – і перамянілася становішча.)

Пра справы "Белпомачы", дарэчы (пра ахвяраваньні), А. Міцкевіч даваў рэгулярную інфармацыю ў "Вестках і паведамленьнях" і ў газэце "Беларус". Але гэта ўсё ў мінулым. Як кажа разважліва і з добрым настроем сам Аляксандар Міцкевіч, "час не чакае і сваё бярэ". У гэтым годзе ў лістападзе Аляксандар Міцкевіч спадзяецца закончыць ужо дзевяноста гадоў і пайсьці на сотку. Як і раней ён жыве беларушчынай. Дык жадаю яму крочыць упэўнена, зычу здароўя і энэргіі! Няхай ягоны вопыт, розум і дасьведчанасьць і надалей служаць людзям на карысьць нашай Бацькаўшчыны Беларусі.

*22 сакавіка 2009 г.*

**Зянон ПАЗЬНЯК**

Viestki547.qxd 9/25/2011 7:03 PM Page 3 (1,1)



# Верасьнёўскі сход Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня

На стаўшым ужо звычным месцы ў Доме Маракоў на 15-й вуліцы на Мангэтане 10 верасьня прайшоў чарговы верасьнёўскі сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Напачатку сходу сакратар аддзелу Валянціна Якімовіч павіншавала прысутных з прайшоўшым нядаўна Днём беларускай вайсковай славы – гадавінай славутай бітвы пад Воршай (1514 г.). Сябар управы аддзелу Віктар Едзіновіч нагадаў прысутным на сходзе аб гістарычных падзеях тых часоў, а старшыня аддзелу Віталь Зайка распавёў пра гістарычнае значаньне гэтай бітвы і Дня беларускай вайсковай славы.

Затым госьця аддзелу спч-ня Вольга падзялілася з прысутнымі інфармацыяй пра падзеі й штодзённае жыцьцё ў Беларусі ў апошні час, пра эканамічнае становішча і настроі людзей.

Былы старшыня аддзелу Антон Шукелойць распавёў пра свае пачуцьці 10-гадовай даўніны падчас тэракту ў Сусьветным гандлёвым цэнтры ў Нью-Ёрку 11 верасьня 2001 году. Прысутныя па прапанове прамоўцы ўшанавалі памяць загінуўшых у той дзень 10 год таму хвілінаю цішы.

Затым сп. Шукелойць спыніўся на некаторых момантах гісторыі старабеларускай дзяржавы Вялікага Княства Літоўскага, калі ў часы Ягайлы беларуская мова гучэла ў каралеўскіх палацах у Кракаве і ў вялікакняскай Вільні, і калі на ёй пісаліся прывілеі й іншыя дзяржаўныя дакумэнты, што сталі часткаю Мэтрыкі Літоўскай – архіву старабеларускай дзяржавы. Сп. Шукелойць пацьвердзіў свой намер на наступных сходах аддзелу прысьвяціць цыкль гутарак пытаньням гісторыі Беларусі.

Затым адбыліся знаёмствы з гасьцямі аддзелу, калі кожны меў нагоду сказаць некалькі словаў пра сябе і свае зацікаўленьні. Падчас знаёмства ўзьнікалі пытаньні пра мову, ужываную на сходах аддзелу. Адна дзяўчына спытала: “А можна па-руску, гэта адна зь дзяржаўных моваў у Рэспублічы Беларусь?” На гэта было патлумачана, што БАЗА прызнае толькі адную, натуральную, мову Беларусі – беларускую – і падтрымлівае яе разьвіцьцё. Пасьля тлумачэньня дзяўчына без заўважных цяжкасьцяў выступіла па-беларуску. Падчас фатасэсіі ў канцы сходу таксама ўзьнікла сытуацыя з выкарыстаньнем лукашэнкаўскага чырвона-зялёнага сьцяжка. Было адзначана, што адным з прынцыпаў БАЗА ёсьць прызнаньне нацыянальным і дзяржаўным сьцягам Беларусі гістарычнага бел-чырвона-белага сьцягу, і што адпаведна БАЗА не прызнае лукашэнкаўскага сьцягу, пад якім адбывалася і адбываецца закрыцьцё беларускіх школаў, працягваецца русіфікацыя і вынішчэньне беларускай культуры.

***Віталь ЗАЙКА***

# Жніўеньскі сход Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня

Чарговы жніўеньскі сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА прайшоў 13-га жніўня. Напачатку сходу старшыня аддзелу Віталь Зайка, коратка азнаёміў прысутных з падзеямі ў Беларусі і зьвязаных зь Беларусьсю за апошні месяц. Ён у прыватнасьці закрануў працяглы валютна-фінансавы крызіс і прадстаўленьне ўрадавымі арганізацыямі Летувы і Польшчы інфармаці для рэжыму Лукашэнкі пра банкаўскія рахункі беларускіх грамадзянаў, на падставе чаго быў арыштаваны кіраўнік праваабарончага цэнтру “Вясна” Алесь Бяляцкі. Наагул, выглядае, што Лукашэнка, як ня раз было раней, набраў закладнікаў для гандлю з Захадам, каб атрымаць фінансавую дапамогу ў абмен на вызваленьне палітвязьняў. Разам з гэтым працягваецца ціск Расеі на рэжым, з тым, каб у абмен на пазыкі за-

***Заканчэньне на бачыне 3***



Viestki547.qxd 9/25/2011 7:03 PM Page 3 (3,1)



# НЕКАЛІ ПІСАЛІ (са старых газэтаў)

*Прадстаўнікі паваеннай эміграцыі ў Амэрыцы ня раз адзначалі, што амаль уся старая дарэвалюцыйная "расейская" эміграцыя з Расейскай імпэрыі складалася пераважна зь беларусаў і ўкраінцаў. Але брак нацыянальнай сьведамасьці вёў іх у шэрагі расейскіх арганізацыяў, і лічылі яны сябе расейцамі. Нажаль, часьцяком тая сытуацыя мінулага часу, хоць у іншых праявах, нагадвае пра сябе й сёньня. Прапануем чытачам у перакладзе артыкул ад 15 верасьня 1931 г. з газэты "Беларуская Трыбуна" (Чыкага, заснаваная ў 1926), якую выдаваў Язэп Варонка, вядомы дзеяч БНР, па-расейску, каб уплываць у нацыянальна беларускі бок на беларусаў Амэрыкі.*

## Беларускае жыцьцё ў Амэрыцы:

### *Беларусы – сапраўдныя лідэры нашай старой эміграцыі ў Амэрыцы*

Для таго, каб судзіць аб сапраўдным твары так званай старой расейскай калёніі ў Злучаных Штатах, досыць прыглядзецца да яе лідэраў, што ўзначальваюць буйнейшыя расейскія (па назве) арганізацыі ўзаемадапамогі. На ўсходнім узьбярэжжы, у Нью-Ёрку, вялікую ролю мае Аб'еднаньне Грамадзкай Узаемадапамогі (РООВА). Старшынём гэтага аб'еднаньня ў 1930-1931 г. г. быў Іван Матусевіч, на новы тэрмін абраны Антон Сапакоў. Абодва – беларусы. На Сярэднім Захадзе, у Чыкага, старшынём Расейскага Незалежнага Таварыства Ўзаемадапамогі (РНЗОВ) шматкротна, а таксама ў мінулым 1930-1931 годзе, быў заслужоны дзеяч гэтага таварыства Ўладзімер Сабінскі, беларус з Пружанаў. На 20-м вышэйшым сходзе арганізацыі старшынём сходу быў беларус са Слоніму Васіль Канашэўскі, і новым старшынём арганізацыі абраны Іларыён Герашчэня. Гэты новы старшыня Чыкагаўскага РНЗОВ – зусім яшчэ малады чалавек, які нарадзіўся ў 1903 годзе ў вёсцы Лешня Быстрыцкай воласьці Слуцкага павету былой Менскай губэрні. У 1910 годзе сямігадовым хлопцам разам з маткай Тацянай прыехаў ён у Злучаныя Штаты да бацькі, які выехаў у Амэрыку на тры гады раней. У Чыкага Ілярыён Герашчэня скончыў перш пачатковую школу імя Томаса Дорманда, а затым у 1923 годзе – тэхнічную гімназію Лейна. Акрамя таго, вучыўся ў царкоўна-парафіяльнай вучэльні пры незалежнай парафіі на Вуд-стрыт. Беручы разам з бацькам і з маткаю самы актыўны ўдзел у арганізацыях, зьвязаных з РНЗОВ, Ілярыён быў заўважаны як энэргічны і здольны грамадзкі працаўнік, і таму быў неўзабаве абраны старшынём.

Наагул, адзначаючы інтэлектуальную сілу беларускіх выхадцаў у так званай "расейскай" калёніі ў Амэрыцы варта ўзгадаць таксама, што найпапулярны ў Злучаных Штатах польскі лідэр, а менавіта, старшыня Zwiazku Narodowego Polskiego, буйнейшай у Амэрыцы арганізацыі палякоў, ёсьць ня хто іншы, як Ян (Іван) Рамашкевіч, беларус-каталік родам зь Віленскай губэрні. Ён лічыць сябе паляком на тых жа падставах, на якіх вышэйадзначаныя праваслаўныя беларусы афіцыйна залічваюць сябе ў расейцы. Так, адыходзячы ад свайго, робяцца яны дзеячамі для іншых народаў.

---

## Жніўеньскі сход

*Заканчэньне з бачыны 2*

бясьпечыць для расейскіх кампаніяў выгодныя ўмовы ўдзелу ў прыватызацыі дзяржаўнага майна ў Беларусі. Прамоўца таксама закрануў тэмы працягу перасьледу апазыцыі ў Беларусі, браку пасьлядоўнай палітыкі Эўразьвязу і кантравэрсійнае пытаньне фінансаваньня дзейнасьці апазыцыі.

Затым перад прысутнымі выступіў былы старшыня Галоўнай управы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня Антон Шукелойць. Ён адзначыў, што сёлета спаўняецца 80 год ягонай палітычнай дзейнасьці ў беларускім нацыянальным руху. Гэтая дзейнасьць пачалася з часоў навучаньня ў гімназіі ў Ашмяне, калі пры правядзеньні перапісу насельніцтва Польскай рэспублікі ў 1931 г. сп. Шукелойць, тады "камісар сьпісовы", фіксаваў нацыянальнасьць апытаных не па мове, якой карысталіся ў касьцеле, але на якой гавораць у сям'і. У выніку колькасьць прадстаўнікоў беларукай нацыянальнасьці перавысіла польскую, што выклікала гнеў мясцовых польскіх уладаў. Затым была вучоба ў Віленскім унівэрсытэце, актыўны ўдзел у працы Беларускага Студэнцкага Саюзу і ў маладзёвай арганізацыі партыі беларускіх эсэраў, арышт прыйшоўшымі Саветамі за "нацыяналістычную дзейнасьць", вызваленьне немцамі, спробы арганізацыі нацыянальнага беларускага жыцьця пад нямецкай акупацыяй, выезд на чужыну, грамадзкая дзейнасьць у беларускіх арганізацыях ЗША.

Затым сп. Шукелойць спыніўся на неабходнасьці веданьня гісторыі Беларусі і валоданьня асноўнымі гістарычнымі фактамі, бо, як вядома, без гэтага немагчымае разуменьне сучаснага становішча і немагчымы рэалістычны пагляд у будучыню і прагназаваньне яе. Сп. Шукелойць падкрэсьліў, што лёс даў яму магчымасьць быць сьведкам асноўных падзеяў беларускай гісторыі мінулага стагодзьдзя, калі адбылося так шмат трагічнага на беларускай зямлі. Разам з тым наяўнасьць маладых беларускіх сілаў, у тым ліку і ў гэтай залі, дае надзею на тое, што справа, якую пачалі беларускія нацыянальныя дзеячы больш як 100 год таму, будзе падоўжаная і даведзеная да перамогі. Затым сп. Шукелойць паведаміў пра сваё жаданьне правесьці сэрыю гутарак на разнастайныя тэмы з гісторыі Беларусі. Прысутныя зь цікавасьцю слухалі прамову ветэрана нацыянальнага руху і воплескамі сустрэлі прапанову прамоўцы.

Затым адбыліся знаёмствы з гасьцямі аддзелу, якія коратка распавялі пра сябе.

У разьдзеле "Рознае" прагучэлі аб'явы і паведамленьні.

**Віталь ЗАЙКА**

## Нью-Ёркскаму аддзелу БАЗА

# Віншаваньне з 20-годзьдзем незалежнасьці Беларусі

Паважаныя землякі, дарагія беларусы!

Віншую ўсіх нас з 20-годзьдзем Незалежнасьці Рэспублікі Беларусь!

25 жніўня 1991 году на нечарговай 5-й Сэсіі Вярхоўнага Савету БССР пасьля доўгіх дыскусіяў і змаганьня дэпутатаў Апазыцыі БНФ з камуністычнай бальшынёй Вярхоўнага Савета была прыпыненая дзейнасьць КПБ (КПСС) у Беларусі і аднагалосна аб'яўлена незалежнасьць краіны шляхам наданьня Дэклярацыі аб сувэрэнітэце статуса канстытуцыйнага закону.

200 гадоў пакаленьні беларусаў праз ахвяры, паўстаньні, турмы і вынішчэньні ішлі да гэтага дня. вось ён настаў. Перад нацыяй адчыніліся сьветлыя пэрспэктывы сацыяльна-культурнага разьвіцьця.

У сярэдзіне 90-х гадоў гэтыя пэрспэктывы былі спыненыя з прычыны ўнутраннай акупацыі краіны і падтрымкі Масквой, аднаасобнай ўлады антыбеларускага рэжыму Лукашэнкі.

Аднак, які б цяжкі час мы зараз не перажывалі, нашая Незалежнасьць ёсьць! Ёсьць дзяржава, ёсьць свой народны дом, а значыць ёсьць і будучыня, якая залежыць ад таго, як пакіруемся мы ў сваім доме, які мы навядзем у доме парадак. Гэта значыць, што наша народная будучыня залежыць найперш ад нас самых. Такія магчымасьці дае нам наша незалежнасьць.

Шануйма яе, як бацьку з маткай, як каханую жонку і родных дзяцей! Дбайма пра гонар і веліч нашай дарагой Бацькаўшчыны Беларусі. Абараняйма яе ад страты і нявoлі, трымайма яе ў сэрцы.

Жыве Беларусь!

Слава героям!

*25 жніўня 2011 г.*

***Зянон ПАЗЬНЯК***

**Уплаты ў Нью-Ёрскі аддзел БАЗА**
Складкі й ахвяраваньні:

| | |
|---|---|
| Т. Асташка | 50 |
| А. Батурын | 50 |
| К. Губская | 50 |
| К. Кабановіч | 50 |
| Г. Калганава | 50 |
| І. Лукашэвіч | 50 |
| М. Меншыкава | 50 |
| Р. Ражко | 50 |
| А. Супрон | 50 |
| Л. Цярпінская | 50 |
| П. Шандра | 50 |

**Усім шчыры дзякуй!**

**Уплаты ў аддзел шліце на адрас:**
*Belarusan American Association*
*P. O. Box 572*
*New York, NY 10113*
**Чэкі выпісвайце на**
*Belarusan American Association.*

*Шаноўныя сябры!*
*Калі Вы атрымліваеце бюлетэнь **"Весткі й Паведамленьні"** як сябар Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА, але не рабілі ахвяраваньняў на ягонае выданьне, калі ласка, паведаміце рэдакцыі (поштаю ці е-мэйлам) аб жаданьні атрымліваць бюлетэнь і, па магчымасьці, падтрымайце выданьне фінансава.*

# НАСТУПНЫ СХОД

Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца **ў суботу 8 кастрычніка 2011 году** на Мангэтане.

Месца правядзеньня сходу:

***Seafarers and International House***
***123 East 15th Street***
***New York, NY 10003.***

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да станцыі **Union Square**.*

*Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Union Square па 15-й вуліцы на скрыжаваньні з Irving Place.*

Пачатак сходу: **а 6:00-й** вечара.

-------------------

*Аб месцы і часе правядзеньня сходаў Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА ды іншых імпрэзаў, ладжаных аддзелам, можна даведацца, наведаўшы ўэбстаронку **www.baza-belarus.org***

*Паважаныя **Д. Краўчук і І. Шашчук** і **М. Запольскі,** паведаміце, калі ласка, рэдакцыі вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*

**Ахвяравалі на выданьне бюлетэня** *Весткі й Паведамленьні* :

| | |
|---|---|
| К. Губская | 80 |
| Т. Асташка | 30 |
| А. Батурын | 30 |
| К. Кабановіч | 30 |
| Г. Калганава | 30 |
| І. Лукашэвіч | 30 |
| М. Меншыкава | 30 |
| Р. Ражко | 30 |
| А. Супрон | 30 |
| Л. Цярпінская | 30 |
| П. Шандра | 30 |
| В. Якімовіч | 30 |

**Шчыры дзякуй!**

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы ў рэдакцыю аплату гадавой падпіскі ($30). Чэкі выпісвайце на імя **Belarusan American Association**.*

*Рэдакцыя бясплатна надрукуе прыватныя некамэрцыйныя абвесткі, а таксама будзе ўдзячная за дасланыя ў рэдакцыю артыкулы, водгукі й лісты.*

*Допісы накіроўвайце на адрас:*
***VIESTKI***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***
*альбо на адрас электроннай пошты:*
***viestki@mail.com***